УДК 821.161.3

**Ганчарова-Цынкевіч Таццяна Уладзіміраўна**
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка
(г Мінск, Беларусь)
wowancc@mail.ru

# ФАЛЬКЛОРНА-ПАЭТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА Ў ТВОРЧАСЦІ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ

У артыкуле разглядаецца творчасць класіка нацыянальнай літаратуры Змітрака Бядулі ў святле фальклорна-паэтычнай культуры беларускага народа.

**Ключавые словы:** народная творчасць, масйстэрства, верш, паэма, літаратура, змест, паэт, форма, культура, проза, казка, лірыка

The article describes folklore features of Z. Byadulya's works. Using illustrations the author tries to follow the influence of people's oral lyrics on the works of the Belarusian classic.

**Keywords:** folk art, skill, piece of poetry, poem, literature, content, poet, form, culture, prose, fairy tale, lyrics

Змітрок Бядуля сваю літаратурную дзейнасць пачаў на пачатку XX стагоддзя. Ён з дзяцінства назаўсёды палюбіў народную паэзію, быў адным з самых актыўных яе збіральнікаў і папулярызатараў. Паэт быў апантана захоплены цудам беларускага фальклору: казкі, міфы, легенды, паданні, песні.

Ужо ў вершаваных спробах сваёй творчасці Змітрок Бядуля паэтызаваў вобразы народнага песняра, народных музычных інструментаў (“Пясняр”, “Гуслі-самаграйкі”, “Гусляр”). Народныя песні прыгожыя сваім натуральным, прыгожым хараством, якое тоіцца ў сіле пачуцця і глыбіні думкі. Творы фальклорных жанраў валодаюць магічнымі чарамі эмацыянальнага ўздзеяння, таму што надзелены высакародным, чалавечым зместам, нясуць у сабе самае дарагое з таго, што напаўняе душу, чым яна жыве і жывіцца.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Зм. Бядуля, арыентуючыся на народна-песенны струмень у вершы "Гусляр", стварае вобраз старога музыкі: *А Змітра старога // Не трэба прасіці // На гутаркі-сходы. // Прыходзіць ён першым, // Выходзіць апошнім. // Ён добра ўсё знае: // Як рэчка спявае, //Як стогнуць сыр-боры, // Як зоркі мільгаюць, // Як родзіцца траўка, // Як неба ў пажары // Мяцеж апранае, // Як плача дзяўчынка // Па хлопцу па любым, // Як тужыць сіротка // Па матцы радзімай, // Як скачуць вяселле, // Спяваюць на полі, // Як гора-нядолю // Ратай спаткае...* [1, с. 85].

Багаты паэтычны падтэкст стаіць за элементарна простымі радкамі. Аўтар выяўляе глыбіню пачуццяў і думак лірычнага героя з дапамогай мастацкай вобразнасці. Як і ў народнай песні, аўтар падае надзвычай сціслыя бытавыя малюнкі толькі штрыхамі, але штрыхі і дэталі надзвычай дакладныя, ёмістыя, вывераныя. А гэта ўсё нацыянальна каларытнае, тыпова беларускае. Так: і рэчка, і бары, і зоркі, і траўка – гэта Беларусь, гэта наша, з маленства знаёмая і любімая прырода. А на фоне блізкіх кожнаму сэрцу прыкмет жыцця і быту беларускай вёскі зварот да сацыяльнай праблематыкі: ... *гора-нядолю // Ратай спаткае* [1, с. 85].

Стыхія народнай песні – гэта акіян вобразнасці і экспрэсіі, колераў, гукаў, фарбаў, якая ўвабрала ў сябе і захавала памяць пакаленняў, вопыт народа. Сэнсавая і эмацыянальна-вобразная прастора фальклорнай песні бязмежная. У ёй месціцца цэлы свет.

Зм. Бядуля ў сваім вершы "Гусляр" выкарыстоўвае як рытміка-інтанацыйную народна-песенную арганізацыю, так і традыцыйныя двайныя эпітаты, якія маюць сінанімічны характар: сыр-бор, гора-нядоля, радасць-шчасце; метафары і інш.

Беларускі мастак слова захапляўся народнай песняй, якая ўяўлялася хвалістым морам, якое мяняецца і некуды бяжыць ("Начлежнікі пяюць"). Таму не выпадкова на маладога Бядулю аказала ўплыў дэкадэнцкая літаратура. Паэта вабяць хісткія, часам прывідныя з'явы жыцця: *// Начлежнікі пяюць. Над вогнішчам туман. // А спеў – вясёлы сум. А галасы – рачулкі. // Плывуць адтуль з кустоў, з асрэбраных палян // Частушкі – як званкі, частушкі – як бразгулкі* [1, с. 11]. Пяюць начлежнікі… Песня плыве невядома адкуль. Усё таемна і казачна.

Бядулевы імпрэсіяністычныя вершы можна разглядаць як праявы сімвалізму ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Так, у вершы "Абліта ззяннем росная паляна…", як і ў творах сімвалістаў пануе эстэтычны пачатак: *Абліта ззяннем зорак росная паляна. // Застыў на мгненне ценяў чулы зарасняк. // З-пад шыза-дымнай хмары круглы месяц глянуў, // У рэчку кінуў-сыпнуў бірузовы смак* [1, с. 33].

Цэлую галерэю падобных вобразаў-сімвалаў, вобразаў-дэталяў мы сустрэнем у вершах "Вісіць серп залаты над спалоханым борам…", "Лезе ў вочы ззянне месяца…", "Рэчка зыбіць сваю зыбку…", "Палумесяц арэ залатыя баразны…", "Б'ецца восень халодная ў рэчную шыбу…" і інш.

Вершы Зм. Бядулі перадаюць красу беларускай прыроды, уражваючы тонкімі адценнямі гукаў і фарбаў навакольнай рэчаіснасці: *Вісіць снежная ноч,*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*вісіць лютая ноч // Сівай футрай над пушчай кашлатаю. // Белым пер'ем снягі, белым сырам снягі, // Долы-горы пад снежнымі шатамі* [1, с. 21].

Пара сімвалізму ў беларускай літаратуры прайшла вельмі хутка, не выйшаўшы за межы першага дзесяцігоддзя XXстагоддзя. Таму вершы-імпрэсіі Зм. Бядулі неацэнны ўклад у гісторыю нацыянальнай паэзіі. Творы паэта ўражваюць музычнасцю і разнастайнасцю ў іх тэм – ноч, раніца, зіма, лета, восень, вясна, рэчка, крыніца, месяц, зоркі, туман, снег, дождж і інш. Вершы зіхацяць яркімі народнымі метафарамі, эпітатамі, параўнаннямі: *Яшчэ бялелі касагоры, // Ад снежных плямаў пара йшла... // ...Рачулкі моршчыліся ў пене, // У крыгі сінія плылі... // ...Пад сонцам грэліся бярозы // У белым тонкім палатне. // І зелянелі вербалозы, // І за гарой папар чарнеў* [1, с. 29]. Імпрэсіяністычныя вершы Зм. Бядулі хоць і адыходзяць ад традыцыйнай народна-песеннай вобразнасці, але ўзбагачаюць паэтычную палітру аўтара асацыятыўнасцю і шматзначнасцю. А гэта толькі падкрэслівае мастацкія вартасці творчасці паэта.

Спынімся на вершах "Песня" ("Як бы плача хто ў лагчыне"), "Брат з сястрой", "Лугам-лугам зеляненькім", "Песня" ("О, сонейка так яснае..."), якія па зместу і форме нагадваюць народную паэзію. Тут распрацоўваюцца лірычныя песенныя матывы аб каханні, аб дзявочай нядолі, аб смерці на полі бою і выкарыстоўваюцца вусна-паэтычныя вобразы і прыёмы: *...А саколік, а Міхалка, // Хоць бядак, але прыгожы. // Сэрца рвецца на кавалкі, // Вочы мутныя ад слёз. // А тым часам родны бацька // На дачку, як воўк, глядзіць* [1, с. 61].

Вышэй адзначаныя творы Зм. Бядулі падобныя да народнай лірычнай песні, дзе выказваюцца самыя розныя чалавечыя пачуцці: любоў і нянавісць, радасць і смутак, весялосць і горыч, ласка і гнеў, спагада і папрок і г.д. Вельмі часта змест песні, канкрэтныя сюжэтныя сітуацыі вымагаюць павышэння тону. У такім выпадку ў песні з'яўляюцца клічныя інтанацыі. У прыведзеным урыўку з верша "Песня" ("Як бы плача хто ў лагчыне!") гэта добра відаць. Такія інтанацыі характэрны для купальскіх песень. Многія народныя песні пачынаюцца воклічамі. Нешта падобнае назіраецца і ў творы Зм. Бядулі "Як бы плача хто ў лагчыне!" [1, с. 61]. Паэт ужывае таксама і характэрны для народна-песеннага сінтаксісу супрацiўны злучнік *а*, напр.: *а тым часам; а саколік; а Міхалка; а муж глядзіць*. Усё гэта яшчэ раз падкрэслівае сапраўднае паэтычнае майстэрства аўтара, які віртуозна валодае ўласцівай народу-моватворцу чуйнасцю да слова і яго месца ў сказе, да музыкі фразы і радка.

Да вершаў народна-песеннага складу Зм. Бядулі блізка стаяць яго лірычныя абразкі. Мастак слова добра ведаў Біблію з яе старажытнымі гісторыямі, паданнямі, легендамі, ведаў ён таксама і народныя казкі, паганскія міфы. Яго ўсё жыццё вабіла фантастычнае і таямнічае. Пад уплывам гэтых напластаванняў Зм. Бядуля стварае рэалістычныя апавяданні, якія ярка адлюстроўваюць жыццё беларускай вёскі. Малюючы тыповыя карціны галечы і пакут, пісьменнік творча выкарыстоўваў народныя хаўтурныя галашэнні ("Тулягі"), замовы ("Гора ўдавы Сымоніхі") і асабліва прыказкі ("Сымон",



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“На Каляды к сыну”, “Пяць лыжак заціркі”, “Умарыўся”, “Летапісцы”). Гэтыя фальклорныя матэрыялы ўжыты пісьменнікам для больш дакладнага і выразнага выражэння ідэйнай задумы твораў.

Асобнае месца ў творчасці Зм. Бядулі займае казка “Ратай”. Яна ўяўляе сабой пераапрацоўку японскай літаратурнай казкі аб памешчыку. У ёй праслаўляецца стваральная праца людзей, якая з’яўляецца асновай жыцця. Такім чынам, пісьменнік звяртаўся не толькі да беларускага, але і да фальклору іншых народаў, узбагачаючы нацыянальную славесную культуру. Гады вучобы ў хедэры і ешыбоце прывілі Зм. Бядулю цікавасць да ўсяго таямнічага, дзіўнага, неразгаданага ў жыцці. Таму лагічным вынікам з’яўляецца яго цяга да незвычайнага. Многія творы цалкам пабудаваны на фальклорных і этнаграфічных матэрыялах (“Адплата пану”, “Палескія байкі”, “Ярыла”).

Паэтычны твор “Адплата пану” мае падзагаловак “З часоў паншчыны”. У творы распрацаваны матывы народных казак і паданняў аб агідных паводзінах памешчыкаў у дачыненні да сялян. Такіх казак і паданняў няmala ў зборніку А.К. Сержпутоўскага «Сказки и рассказы белоруссов-полешуков» (1911 г.). Відаць, гэтым зборнікам карыстаўся Зм. Бядуля, асабліва пры стварэнні паэм “Адплата пану” і “Палескія байкі”.

Паэма “Палескія байкі”, напісаная ў 1922 годзе, пазней дапрацоўвалася і рэдагавалася. Пры напісанні твора аўтар выкарыстаў багаты фальклор Палесся: павер’і, казачныя сюжэты, паданні, легенды. Для Бядулі міф цалкам зліваўся з паэзіяй народа, з яго рэлігійнымі вераваннямі, уяўленнямі старажытных продкаў аб прыродзе.

Народна-паэтычныя творы падобнага роду шырока бытавалі сярод насельніцтва беларускага Палесся. Непраходныя лясы і балоты, няведанне законаў прыроды спрыяла таму, што палешукі стварылі сабе своеасаблівы фантастычны свет, своеасаблівую філасофію дабра і зла. Гэты фальклорны матэрыял і лёг у аснову паэмы “Палескія байкі”: *То не сны-туманы, не імгла аблягла // Густым невадам пушчы, даліны, – // Гэта ўздоўжку ў шыр-даль зданяў цьма наплыла, // Як паводка ў Палессе-краіну. // Крычыць мшалы лясун “го-го-го!” у бары. – // Ён лясны гаспадар ганаровы; // У кароне з галля, ў світцы з цёмнай кары // Ён сядзіць на пасадзе дубовым. // Цягне-топіць людзей у вадзе вадзянік, // І русалкі там ладзяць ігрышчы. // У хаціне жыве стары дзед-дамавік, // Злы гуменнік сядзіць на гумнішчы* [1, с. 298].

“Палескія байкі” вызначаюцца высокім паэтычным майстэрствам. У іх захаваны сэнс народных касмаганічных легенд. Зм. Бядуля нібы вяртае паэзію да старажытнай сакральнасці, магіі замоў і заклінанняў. Яго паэзія – гэта своеасаблівая духоўна-мастацкая вера ў цудадзейныя магчымасці слова. Для паэта дастаткова павер’яў, бо ў іх заключана сапраўдная паэзія. Ён глядзіць на свет далёкага продка: свет поўны міфічных істот, кожная рэч, кожная раслінка мае сваё жыццё, як і чалавек.У поўнай адпаведнасці з народнай творчасцю мастак слова ў паэме “Палескія байкі” намаляваў вобразы добрага бога і зло-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

га чорта. З лёгкім гумарам паказаны ў творы стваральнік Палесся і яго вораг "нячысцік". Гэта відавочна ў такіх раздзелах, як "Што было да стварэння Палесся", "Бог, чорт і дуда", "Як бог стварыў Палессе", "Граючы на дудзе, бог стварыў птушак, звяроў і першага палешука", "Чорт украў у бога насенне": *Бог плыве на чаўне, а тым часам злы чорт // Круць і верць вакол божае вабы... // ...Раптам лапу тыц-мыц, цапнуў жменю дабра, // Проста з рук вырваў божых чарцюга. // Ён насенне глынуў і паплыў, як мара, // Рагатаў жарабцом лайдацюга* [1, с. 282–283].

У "Палескіх байках", як і ў фальклорных творах, чорт і ведзьма ўвасабляюць варожыя народу сілы ("Як чорт стварыў балота", "Чорт варыць ствуху палешуку на згубу", "Як парабіліся чартоўскія дарогі і як паляшучка зрабілася ведзьмай", "Агідныя ўчынкі ведзьмы" і інш.). З імі заадно выступаюць паны і папы. Гэтая думка падкрэсліваецца ў паэме двума раздзеламі: "Палешукі і паны" і "Палешукі і поп", якія Бядуля ўнёс у свой твор некалькі пазней, каб узмацніць сацыяльнае гучанне твора. У гэтым выпадку аўтар творча скарыстаў фальклорныя матэрыялы – казкі сацыяльнага зместу. У духу народных казак і легенд ён выразіў адвечную мару народа аб яго волі, яго веру ў лепшае будучае ("Плоймы зданяў пануюць над Палессем"): *Забудуецца край. Загрыміць на ўвесь свет // Небывалаю славай-грымотай; // Паляшук зажыве, бы пад сонцам мак-цвет, // Заваюе навекі балота* [1, с. 299].

У 1924 годзе была выдадзена асобнай кніжкай фальклорна-этнаграфічная праца Зм. Бядулі "Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных песнях і казках", дзе даследавалася вусна-паэтычная творчасць. Скарыстаўшы фальклорныя зборнікі П.В. Шэйна, Е.Р. Раманава, А.К. Сержпутоўскага, ён звяртае ўвагу на сацыяльныя матывы народнай міфалогіі. Захапіўшыся цудам і харраством народнай казкі, песні, аўтар піша свой лепшы твор-аповесць "Салавей".

Пасля аповесці "Салавей" Зм. Бядуля піша творы для дзяцей "Дзедмароз", "Іваначка-прастачок", Мурашка Палашка", "Сярэбраная табакерка", "Скарб" і інш.. Яны напісаны па матывах і сюжэтах займальных беларускіх казак, што забяспечыла ім поспех сярод юных чытачоў. Але ў адрозненне ад казкі фальклорнай, "літаратурныя" казка пісьменніка, захоўваючы паэтыку народнага твора, вызначаюцца псіхалагізацыяй паводзін і ўчынкаў герояў.

Такім чынам, Зм. Бядуля больш чым хто з беларускіх пісьменнікаў свайго часу захапляўся паганскай міфалогіяй, беларускім фальклорам. Асаблівую ўвагу пісьменніка прыцягвала казка, яе фантастычна-таемная загадкавасць: дарога пазнання чалавека і навакольнай прыроды. Усё гэта знайшло найпаўнейшае ўвасабленне ў яго мастацкай творчасці.

**Літаратура**

1. Бядуля, Зм. Збор твораў у 4-х т. / Зм. Бядуля. – Мн. : Дзярж. выд-ва БССР, 1952. – Т. 2. – 444 с.

2. Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мн. : Беларуская навука, 2004. – 227 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова